Галіна Багданава



...Праз недабудаваныя дахі
так лёгка прасьвечваюць зоры......

# Рыгорава зорка

***Вандроўка між Сітніцавых хацінак і храмаў.***

*Спачатку было Слова, што выказала Думку і ўвасобілася*
*ў рэчы, зьявы, істоты. Рэч ёсьць матэрыялізацыя думкі,*
*якая паядноўвае ў сабе зямное й нябеснае, мізэрнае*
*й велічнае, адназначае й бясконцае, традыцыйнае й сучаснае...*

З гэтай высновы мастака і паэта Рыгора Сітніцы мы і пачнем спасьцігаць ягонае зямное ўзыходжаньне да сваёй, лёсам вызначанай яму нябеснае зоркі. На кожнай прыступцы для вас рэхам будуць гучаць ягоныя ўвасобленыя ў словы думкі.

**Прыступка першая. Каханьне.**

*Усё вымяраецца па тым,*
*як ты ставішся да таго, каго кахаеш...*

На вакне расквітнеў калючы пузан-кактус. Пэўна ж, многія з вас ведаюць — пяшчотная такая, ружовая, мякка-водар-

ная кветка, якая трымаецца ўсяго нейкія суткі. Яна нагадвае музычны інструмент, а можа, прыслуханае да чароўных гукаў вуха. Рознае яму даводзіцца чуць у чалавечым атачэньні. Вось і вяне. У бабулі маёй, у Вялікім Боры Хойніцкім быў такі, у бацькі, тут, у Мінску, і ў мяне ў хаце таксама. І гэты, Сітніцаў — з Гомельшчыны. Дзіўная расьліна, дзіўная кветка. За нейкае ўсяго імгненьне, хвілінку ейнае водарнае, хмельнае пяшчоты можна аддаць усё...

Ведаеш, Рыгор, за што цябе больш за ўсё шануюць вучні? За твае адносіны да жонкі. Мужны, можа быць, адзін з самых мужных у сучасным беларускім мастацтве мастак (хто ж, як ня ты скамандаваў наструненым дзідам: «Рубон!» яшчэ тады, у 1993 годзе?), ты ўжо столькі гадоў хаваеш у сваёй душы нязнаную пяшчоту, рэальным сімвалам якой хочаш-ня хочаш сёньня ёсьць твой сын Міколка, адораны музыка, які сьпявацець пачаў раней, чым гаварыць...

Але спачатку былі «Кветкі для Іны». Партрэт, каляровая літаграфія, якой сёлета, паверыць цяжка, дваццаць гадоў. Юбілей. Ты ўбачыў сваю Іну ў хвіліну пяшчоты, такой чаканай, жаданай і недасяжнай для цябе на той час. Фёдар Дастаеўскі, параўноўваючы фатаграфію з партрэтам, пісаў: «У рэдкія толькі імгненьні чалавечы твар выяўляе галоўную рысу сваю, сваю самую характэрную думку». Ты здагадаўся, спасьціг тую думку і адшукаў для яе слова... І Бог узнагародзіў цябе за тое...

Неяк ты прызнаўся:

— Перад тым, як намаляваць партрэт Іны, я зрабіў графічны аркуш нечым да яго падобны — «Багдановіч і Вераніка». Зараз разумею, што гэта невыпадкова. Свае пачуцьці заўсёды зьвяраеш з высокімі ўзорамі. У паэзіі Багдановіча я дакрануўся да найвышэйшай чысьціні. Бачыў чалавека і ягоны ідэал, чалавека, які ўзьвялічвае свой ідэал. Я рабіў партрэт ня дзеля таго, каб недзе яго паказваць. Намаляваў, павесіў у сябе і глядзеў на яго.

Праз шмат гадоў, калі сталася ўжо так, як мусіла стацца, ты расказаў амаль дэтэктыўную гісторыю, пра тое, як прывёз партрэт Іны ў Гомель, хацеў падарыць яго ёй на дзень нараджэньня, як знаёмы хлопец панёс яго ёй, а ты застаўся чакаць на вуліцы. І міліцыянты прынялі вас за хуліганаў, адзін з якіх пайшоў ці то сьцены ў пад'езьдзе расьпісваць, ці то дзьверы рэзаць, а другі застаўся чакаць пад домам. А ты расказаў ім усё шчыра, і яны прыйшлі ў захапленьне. Ня толькі паверылі, а яшчэ на сваім "варанку" да вакзала падвезьлі.


*Рыгор Сітніца.*

Вось і твае вучні, у Рэспубліканскім каледжы мастацтваў імя Ахрэмчыка, дзе ты сам вучыўся, а цяпер выкладаеш, найперш шануюць цябе за тое самае. За шчырасьць і пяшчоту, якую — вы, мужчыны, лепш за нас, жанчын, ведаеце гэта — трэба мець вялікую мужнасьць, каб выказаць.

## Прыступка другая. Настаўнікі.

*Найярчэйшае адчуваньне сябе*
*мастаком было ў маленстве.*
*Але пасьля чым болей я спасьцігаў*
*нешта ў мастацкім сьвеце,*
*тым большымі былі мае сумненьні*
*ва ўласнай вартасьці,*
*якія аднак кожнага разу змушаюць*
*мяне новымі намаганьнямі*
*ў працы даказваць сабе самому,*
*што я тое-сёе ўмею.*
*Гэтае пераканаНьне трывае нядоўга*
*і ўсё пачынаецца наноў.*

Каханыя ўзносяць нас да нябёсаў. Настаўнікі, як і бацькі, цярпліва вучаць хадзіць па зямлі.

Ізноў, Рыгор, згадваючы твой лёс, разумею, што жывое жыцьцё рэч значна больш захапляючая, чым якая б ні была кніга.

Сёлета ў адну з газетаў зьвярнуўся твой, Рыгор, настаўнік Іван Пятровіч Малінкоўскі, той самы, што калісьці прыехаў у тваю родную вёску Курыцічы Петрыкаўскага раёну і навучыў цябе граць на баяне. Ён прачытаў пра тое, што цябе адзначылі медалём Язэпа Драздовіча і зацікавіўся, ці ня той самы гэта Рыгор Сітніца, якога ён калісьці з далёкай палескай вёсачкі (далёкай, і ніяк ужо не глухой, калі там жылі такі настаўнік і такі вучань!) прывёз у Мінск, у Рэспубліканскі каледж мастацтваў, вучыцца на мастака. І ты, Рыгор, зараз жа адказаў: той самы, Іван Пятровіч, даражэнькі, я той самы Рыгор Сітніца. І прызнаўся, што, згадваючы ягонае імя ў шматлікіх сваіх інтэрв'ю, ты спадзяваўся на сустрэчу.


*Новы дом II (1995).*

Калісьці Іван Пятровіч убачыў, як апантана, захоплена ты малюеш, ацаніў твае першыя спробы алоўка, ды фарбаў і здолеў угаварыць ня толькі бацьку твайго, але і маці адпусьціць цябе ў няблізкі сьвет па навуку.

Уяўляю: пустыя калідоры тады Рэспубліканскай школы-інтэрнату (цяпер Рэспубліканскага каледжу мастацтваў), толькі рэха гуляе. Уступныя экзамены скончыліся, усе на канікулах. Каб не Ягор Батальёнак якога вы выпадкова сустрэлі, хто ведае, як склаўся б твой, Рыгор, лёс. А той, убачыўшы твае працы, паверыў у цябе, пераканаў прыняць па-за конкурсам.

Потым было аддзяленьне графікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытуту (цяпер — Беларуская Акадэмія мастацтваў). Васіль Пятровіч Шарангові́ч, Уладзімір Савіч, якія навучылі цябе быць вельмі сабраным, дысцыплінаваным, і ў той жа час заўжды вольным у стыхійным, Боскім акіяне творчасьці. Разам з табою вучыліся такія яркія, вядомыя сёньня мастакі-графікі, як Уладзімір Вішнеўскі, Вячаслаў Паўлавец, Міхась Будавей. Люблю, калі кажуць: «Каб не было сябрыны, то не было б Скарыны». Твая, Рыгор, Сябрына адмысловая, выкшталцоная. І калі ты прызнаўся аднойчы, як пра патаемнае, што выходзячы з майстэрні таго ж Савіча табе хочацца працаваць, што ён для цябе як матор... Гэта многага каштуе.

І, ведаеш, твая маленькая майстэрня на прасьпекце Скарыны, у самым, можа, мітусьлівым, шумным месцы, для мяне таксама ўзыходжаньне да сьвятла і цішыні. Да Натхненьня і Творчасьці. Аловак, якім ты больш за ўсё любіш працаваць, такая дзіўная тэхніка. Аловак пакідае на белым аркушы, асабліва, калі ён вялікі, жывое паветра. І блукаючы разам з табою «уздоўж паркану» ці каля муроў Ішкалдзі, Каложы, ці Нясьвіжу, заўжды стае моцы дыхаць на поўныя грудзі... Так, як вучылі цябе, твае настаўнікі, Настаўнікі з вялікай літары.

## Прыступка трэцяя. Бацькаўшчына.

*Кожная нацыя спраўджвае сябе ў нацыянальна адметнай рэчаіснасьці, дзе думка, рэч, зьява маюць нацыянальнае аблічча, якое пераходзіць у вобраз, народжаны творчасьцю...*

Прызнаюся шчыра, у 1995 годзе менавіта твая серыя «Новы дом» — увасоблены табою з розных ракурсаў дах недабудаванае хаты — падказала мне, прадказала мне будучыню. Свае нататкі пра выставу, на якой упершыню экспанаваліся згаданыя графічныя аркушы,

я назвала «Босыя на сьнезе». І фізічна адчула — халодна нагам, і, страшней за ўсё — няма даху над галавой... Можна бясконца любавацца, захапляцца рытмікай, суладдзем бэлек і крокваў... Сёньня, гэта, бадай, адзінае, што нам застаецца. Затое праз недабудаваныя дахі так лёгка прасьвечваюць зоры...

Ізноў на памяць прыходзяць твае, Рыгор, словы:

— Мастак ня можа тварыць ці падрабляць тое, што аднойчы было ўжо створанае Богам, а таму творчасьць зьдзяйсьняе рух ад звычайных рэчаў і штодзённых зьяваў у бясконцую прастору пачуцьця і думкі, якія, пераасэнсоўваючы рэальнасьць, нараджаюць вобраз, знак, сімвал.

Тваё, Рыгор, узыходжаньне да знаку, сімвалу ішло праз дакладнае вывучэньне рэальнасьці. Ты ведаеш усё тое, што малюеш ня толькі на вока, а і на вобмацак, і менавіта гэта дапамагае табе захаваць цэласнасьць, перадаць сутнасьць, абраць дакладны ракурс («Шпацыр уздоўж паркану» — гэта твой шпацыр, ды і мой шпацыр у далёкім маленстве, а ля старажытных муроў ты становішся так, каб адчуць сваю мізэрнасьць у параўнаньні з вялікай, шматгадовай гісторыяй). Памятаеш, Рыгор, ты сказаў:

— Структуру, характар, дух рэчаў я імкнуся вывучаць гэтак жа сама, як я ўглядаўся б у твар знаёмага чалавека. А калі падумаць, што ў камяніцах Сынкавічаў, Ішкальдзі, Каложы стагоддзямі гучала Слова Божае і людскія малітвы, дык хіба можна лічыць іх нежывымі?

Твае малюнкі вельмі фактурныя (адразу пазнаеш, ці гэта бульба, ці цыбуля, ці старое дрэва, камень) і адначасова сімвалічна абагуленыя.

Пішу пра малюнкі (у малюнку алоўкам табе сёньня на Беларусі, пэўна, сапраўды, роўных няма), але ж, ведаю ты працаваў у розных графічных тэхніках. Першая твая серыя была прысьвечаная народным майстрам. Мне, як і табе, пашчасьціла засьпець на гэтай зямлі, сустрэцца з многімі з іх. І калі сёньня бачу, з якім захапленьнем і дарослыя, і дзеці плятуць з саломкі, перад вачыма вобраз табой ува-



*Нясьвіж. Брама ў мінуўшчыну. (1992).*

собленай выдатнай саломапляцельшчыцы з Брэсту, пачынальніцы сучаснага саломапляценьня, незабыўнай Веры Гаўрылюк. Як сьветла, таемна ўсьміхаецца яна сярод ёю сьплеценых саламяных, сонечных птушак... Былі ў цябе і творы, прысьвечаныя Вялікай Айчыннай. Балесныя творы, з радкамі апаленых вайною пісьмаў. Бацька твой ваяваў. Праз яго вайна табе была, як перажытая...

Быў у цябе, Рыгор, і цудоўны аркуш, прысьвечаны вечнаму вандроўніку па зямных і касьмічных прасторах Язэпу Драздовічу.



*Краіна забыцьця I. (1996).*



*Сьвятло адвечнае III (1996).*

А яшчэ на тваіх графічных аркушах жыла і жыве, гучыць нашая Гісторыя.

Вось ты запрашаеш у Нясьвіж. І раптам ажываюць «Прывіды старога парку», «Брама ў мінуўшчыну», «Рэха даўніх часінаў». Героі сармацкіх партрэтаў, сэнсам якіх мастацтвазнаўцы лічаць «закансерваваны рух», вядомыя нашыя князі і князёўны, Радзівілы, у цябе, побач са створанай у іх час архітэктурай, пачынаюць, дзіўным чынам ажываць. Яны больш жывыя і рухомыя, чым на тых самых «закансерваваных» сармацкіх партрэтах.

А з якім дзіўным, хвалюючым пачуцьцём увасабляеш ты Храмы. То набліжаючы, то аддаляючы ад нас старажытныя муры, ты быццам прапануеш дакрануцца да іх, каб прыняць благаславеньне.

А Мінск, які табе стаў родным, ты ўвасабляеш і з глыбіні («Няміга»), і з вышыні («Няміга. Горад з нашай памяці»)...

Чым далей вобраз, які ты спрабуеш узнавіць, тым больш расьцякаецца, разьбягаецца па аркушы «смуроў» (тваё слова) — кропачак, рысачак, у якім дзіўным чынам сапраўды ўвасабляецца плынь жывога жыцьця, плынь часу («Краіна забыцця». 1996).

І што б ні казалі, кожны твой аркуш заўжды ёсьць вобраз-сімвал Бацькаўшчыны.

У Польшчы жыве сёньня вядомы ў сьвеце беларускі мастак Лёнік Тарасэвіч. І многія ягоныя жывапісныя палотны паводле формульнага, архітыповага выкрыцьця і ўвасабленьня зьяў і мілых сэрцу малюнкаў сугучныя тваім графічным аркушам. Але не, у цябе рэчаіснасьць больш рэальная, яна гіперрэальная. Так можна ўглядацца ў тое, што, адчуваеш, можаш страціць. І ад гэтага балюча да сьлёз....

У побыце ты бачыш быційнасьць. І дровы, і цыбуля, і бульба сапраўды, як азначаеш ты, «Сьвятло адвечнае», бо яны, у звыклай сваёй простасьці, — ключ для іншых, каб зразумець беларусаў, і ключ для саміх беларусаў, каб зразумець саміх сябе.

А ў еўрапейскім мастацтве гэтыя вандроўкі па розных часах і прасторах называюць постмадэрнізмам. Не выпадкова ж ты, Рыгор, «сябруеш з такімі знанымі ў сьвеце беларускімі музычнымі калектывамі як «Палац» і «Крыві», вядзеш фолькмадэрновы фестываль. І любіш паўтараць, што прынцыпова не іграеш «папсу», толькі джаз і фольк-мадэрн.

Фолькмадэрн — гэта і твой «Шпацыр уздоўж паркану», якому прысьвяціў вершы Рыгор Барадулін, «Восень на Палесьсі». А джаз, усур'ёзным, глыбокім яго разуменьні, напэўна, і серыя «Замак», дзе — Мірскія муры раптам ажываюць радкамі Алеся Разанава...

> «Камень — камель часу: усё іншае
> у параўнаньні з ім зьменлівае
> і нетрывалае...»

Дзіўна, толькі цяпер зразумела, што ты, Рыгор, знайшоў, адшукаў ня толькі для сябе, а і для нас у зьменлівым часе камень-камель... Хай сабе праз дах, праз страху прасьвечваюць зоркі. Але ж хата ўжо стаіць, тут, на роднай нашай зямлі ўжо стаіць хата і гадуюцца дзеці, якія змогуць яе дабудаваць. Побач з замкамі сваіх продкаў сваю ўласную хату, свой родны дом.

## Прыступка чацьвёртая. Сьвет.

*Там, у Грэцыі, усё наўкола*
*сьцьвярджае аксіёму,*
*што народ, калі ён моцны духам*
*(традыцыяй, гісторыяй, культурай),*
*немагчыма перамагчы ані*
*трохсотгадовым ігам, ані сучаснымі*
*урбаністычнымі працэсамі...*

Выстава, якую наладзіў ты, Рыгор, пасьля вяртаньня з Грэцыі, называлася «Рата-

ваньне Грэцыяй». Ты вандруеш па сьвеце ня дзеля таго, «каб любіць Беларусь нашу мілую», а дзеля таго, каб паверыць у яе будучыню, у нашую будучыню...

Выдаўшы пад знакам-каронаю Беларускай Акадэміі выяўленчага мастацтва, праўдзейным членам якой ты зьяўляешся, свой каталог, каталог тваіх твораў, ты, пэўна ж, нездарма зьмясціў два свае партрэты. Адзін, ты сурьёзны і заклапочаны, у паліто не і шаліку, ля нашых, родных, старажытных муроў. Ёсьць сьцяна і няма неба. Другі — ты лёгкі і ўзьнёслы, на фоне старажытна-грэцкага Парфенона.

Узыходжаньне на Акропаль для кожнага мастака — вымярэньне сябе, як асобы. Ты, пэўна ж ведаеш, што Парфенон, як і большасьць старажытнагрэцкіх храмаў, збудаваны як перыптэр, што значыць — «акрылены». Крылы Парфенона — ягоныя калоны, скрозь сьляпучую беласьць якіх заўжды можна ўгледзець неба...

— Галоўныя колеры, якія прыносіш з Грэцыі — гэта беласьць і блакіт, і менавіта, яны, гэтыя колеры, ёсьць на дзяржаўным сьцягу сучаснай Грэцыі...

Добра памятаю гэтыя твае словы. А яшчэ тады, адразу пасьля твайго вяртаньня са старажытнай і вечна юнай Грэцыі, я напісала:

«Сустрэча з Грэцыяй многім нагадвае сустрэчу з уласным маленствам. Гэтая загадкавая, сьветлая краіна сапраўды здольная ці ня кожнаму вярнуць першаснасьць, сьвежасьць успрыманьня, любоў да жыцьця... Суадносячы сваё мастацтва з класікай, заўжды міжволі суадносіш яго з гісторыяй і з вечнасьцю...»

Мне было цікава дазнацца, вандроўка ў Грэцыю была для цябе сустрэчаю з нечым добра знаёмым ці ўзыходжаньнем да новай вяршыні, адкрыцьцём. І ты сказаў мне тады:

— Тыя кніжныя веды пра Старажытную Грэцыю, якія я меў, аказаліся проста нічым у параўнаньні з непасрэднымі ўражаньнямі. Я езьдзіў у Грэцыю два разы, і другая мая вандроўка па выспах Эгейскага мора яшчэ больш замацавала першае ўражаньне. Гледзячы на калоны Парфенона ці храма Зеўса Алімпійскага, пачынаеш думаць пра час не як пра пэўны момант, падказаны табе гадзіньнікам, а як пра катэгорыю абсалютную, касьмічную, неабсяжную, дзе любая старажытная рэч ёсьць сьлед,



*Ратаваньне Грэцыяй II. (1996).*

знак, рэха абсалютнага часу. Калі чалавек слабы, дык у сутыкненьні са старажытнасьцю ён рызыкуе яшчэ глыбей усьвядоміць сваю мізэрнасьць і прымітыўнасьць. Чалавек жа моцны духам толькі памножыць сваю моц усьведамленьнем таго, што асноваю і сутнасьцю ўсяго вартага і вялікага зьяўляецца высокі Дух, як вышэйшы субстант Божага сьвету.

Ведаеш, Рыгор, я люблю твае грэцкія аркушы, ня толькі таму, што ў іх шмат блакіту і беласьці, якія ўжо самі па сабе натхняюць, і не таму, што ты разглядаеш прызнаныя ўсім сьветам помнікі з цікаўнасьцю вясковага хлапчука, і сам таго ня ведаючы, даеш адказы на пытаньні, якія зьяўляюцца ва ўсіх, хто пачынае вывучаць гісторыю



*Ратаваньне Грэцыяй IV. (1996).*

мастацтва гэтай загадкавай краіны... Вось побач з калонаю яшчэ адна — упала і рассыпалася на ўжо нічым не змацаваныя кавалкі-барабаны, з якіх і складаюцца ўсе калоны. А вось прыступкі знаёмага ўсім амфітэатру, блізка-блізка, так, што можна ўгледзець усе трэшчынкі. І раптам, у нейкае імгненьне цябе ахоплівае проста касьмічнае, глабальнае адчуваньне зыходу, пустэчы, якая рэхам блукае сярод калон... У гэтай пустэчы, у гэтым рэху знойдзецца месца фарбам і голасу кожнага з нас... У падарожжа выпраўляюцца, каб убачыць сьвет сваімі вачыма і перадаць свае ўражаньні так, як не рабіў да цябе ніхто...

Таму, што ж дзівіцца, твае творы сёньня ёсьць у розных краінах сьвету, а ў адной нямецкай прыватнай калекцыі іх зьмясцілі між Вазарэлі і Гутуза.

## Прыступка пятая. Сусьвет.

*Усё нашае жыцьцё —*
*гэта барацьба за чысьціню.*
*І задача кожнага творцы –*
*уздымаць, узвышаць гэтую чысьціню*
*да ўзроўню класічных паняцьцяў,*
*агульначалавечых каштоўнасьцяў...*

І ўсё ж невыпадкова, Рыгор, што мы з табой пазнаёміліся на Купальле. Дачка незабыўнага нашага старэйшага сябра, нашага выкладчыка, выдатнага этнографа і мастака Міхася Раманюка Алеся сёлета, сустрэўшы мяне каля Акадэміі мастацтваў, радасна, узьнёсла так сказала: «Я сёньня была на Купальлі. Ведаеце, — я ўсё адно як хрышчэньне Купальлем прыняла..» У той год хрышчэньне Купальлем прымала я. Да драбніцаў памятаю тое сьвята. Як мы чакалі ачышчэньня вадою і агнём. Як дзяўчаты, пускалі вяночкі, а хлопцы скакалі праз вогнішча. А потым між хвоек блукалі агеньчыкі паходняў, а ты іграў на гармоніку. Танчылі, сьпявалі да раньня... Калі-небудзь тое Купальле, дакладней, рэха таго Купальля я пачую ў адным з тваіх твораў...

Перачытваючы твае вершы, якія ты пісаў з самага юнацтва, а адважыўся аддаць у друк толькі цяпер пасьля сарака (першая публікацыя ў «Полымі» і адразу — прэмія! Фенаменальна, але заслужана!), дык вось, перачытваючы твае вершы, я чую рэха твайго голасу і тых вечароў, калі слухала іх ад цябе. Я пасьля доўга не магла нічога чытаць. Усё было ня тое, мне не ставала глыбіні і вышыні...

І яшчэ я хачу аднойчы пачуць у тваіх графічных аркушах рэха аднаго Лагойскага вечару (вы тады з Інаю і Міколкам некалькі дзён гасьцявалі ў нас у Лагойску). Калі мы ішлі праз сонны гарадок і сьпявалі. Дакладней, сьпявалі вы з Міколкам, гучна, прыгожа. А мы ўсе былі вашым рэхам. І закінь галаву — такія зоркі буйныя. Проста душу засмоктваюць... «Мы ўсе ляцім да зораў». А сварак і звадак няма між намі, калі мы сьпяваем, творым, ці, стаўшыся рэхам, слухаем адно аднаго і спрабуем зразумець. Так пракладаецца шлях у вечнасьць..

Дзякуй табе, Рыгор, за мужнасьць і пяшчоту. І лёгкага ўзыходжаньня табе да сваёй Зоркі.